# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

21 ЛІСТАПАДА 1996 года
чацвер
№17
(1753)


**СЁННЯ Ў НУМАРЫ:**

Як пражыць на стыпендыю? На гэтае пытанне спрабуе адказаць наш карэспандэнт.

Рэпартаж з адкрытага турніра на кубак універсітэта па брыджу.

Стар. 2

Асцярожна, "Гербалайф"! ці Суб'ектыўныя нататкі з адной прэзентацыі.

Стар. 3

Новая рубрыка, прысвечаная памятным датам у гісторыі БДУ.

Стар. 4

## Віншуем!

БДУ 75

Паводле Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 31 кастрычніка 1996 года за выдатныя дасягненні ў галіне навукі і адукацыі медалём Францыска Скарыны ўзнагароджаны Аношка Валерый Станіслававіч — загадчык кафедры глебазнаўства і геалогіі, Капуцкі Фёдар Мікалаевіч — загадчык лабараторыі фізічнай хіміі і мадыфікацыі цэлюлозы навукова-даследчага інстытута фізікахімічных праблем, Шарапа Аляксандр Віктаравіч — дэкан факультэта міжнародных адносін, Юхо Іосіф Аляксандравіч — прафесар кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права.

• • •

За вялікі асабісты ўклад у падрыхтоўку высокакваліфікаваных кадраў, шматгадовую плённую педагагічную і навуковую дзейнасць званне "Заслужаны работнік адукацыі Рэспублікі Беларусь" прысвоена Загарульскаму Эдуарду Міхайлавічу — загадчыку кафедры археалогіі, этнаграфіі і дапаможных гістарычных дысцыплін, Карзюку Віктару Іванавічу — прарэктару па вучэбнай рабоце, Мулярчыку Сцяпану Рыгоравічу — дэкану факультэта радыёфізікі і электронікі, Цікоцкаму Міхаілу Яўгенавічу — прафесару кафедры стылістыкі і літаратурнага рэдагавання. Званне "Заслужаны дзеяч навукі Рэспублікі Беларусь" прысвоена Барышэўскаму Уладзіміру Рыгоравічу — дырэктару навукова-даследчага інстытута ядзерных праблем пры БДУ, Зелянкову Анатолю Ізотавічу — загадчыку кафедры філасофіі і метадалогіі навукі, Камяку Анатолю Іванавічу — загадчыку кафедры лазернай фізікі і спектраскапіі, Юрчуку Мікалаю Іосіфавічу — дэкану механіка-матэматычнага факультэта. Званне "Заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь" прысвоена Юркевічу Мікалаю Рыгоравічу — прафесару кафедры грамадзянскага працэсу і працоўнага права.

За значны асабісты ўклад у развіццё харэаграфічнага мастацтва званне "Заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь" прысвоена балетмайстру народнага ансамбля танца "Крыжачок" Янушкевіч Наталлі Леанідаўне.

• • •

Згодна з Пастановай Кабінета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 30 кастрычніка 1996 года за шматгадовую плённую навукова-педагагічную дзейнасць, вялікі асабісты ўклад у падрыхтоўку высокакваліфікаваных кадраў узнагароджаны Ганаровай граматай Кабінета Міністраў Рэспублікі Беларусь Бабкоў Уладзімір Васільевіч — загадчык кафедры вылічальнай матэматыкі факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі, доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар, Каратаева Тамара Пятроўна — дацэнт кафедры неарганічнай хіміі, намеснік дэкана хімічнага факультэта, кандыдат хімічных навук, дацэнт, Ксенафонтаў Міхаіл Аляксандравіч — загадчык лабараторыі фізіка-хіміі палімерных матэрыялаў і прыродных арганічных злучэнняў навукова-даследчага інстытута прыкладных фізічных праблем, доктар фізіка-матэматычных навук, старшы навуковы супрацоўнік, Пракураў Анатоль Уладзіміравіч — загадчык лабараторыі інфармацыйна-вымяральных сістэм НДІ прыкладных фізічных праблем, кандыдат тэхнічных навук, дацэнт, Фядосік Віктар Анатольевіч — загадчык кафедры старажытнага часу і сярэдніх вякоў гістарычнага факультэта, доктар гістарычных навук, прафесар.

## Запрашэнне

З 29 лістапада па 1 снежня музей землязнаўства Белдзяржуніверсітэта прыме ўсіх, каго вабіць дзіўны свет камянёў, на выставе "Каменная казка". Гэтым разам яе ўдзельнікамі будуць аматары-калекцыянеры, якія прадставяць лепшыя экспанаты радкіх мінералаў і каштоўных камянёў з уласных калекцый. Сярод іншых удзельнікаў з Санкт-Пецярбурга, Масквы, Екацярынбурга, Крывога Рога, Кіева, Данецка свае сувеніры прадставяць школьнікі з геалагічнага гуртка г.Гродна.

*Выстава адбудзецца ў памяшканні геаграфічнага факультэта.*




## Аб'явы

### *БЕЛАРУСКІ РЭСПУБЛІКАНСКІ ФОНД ФУНДАМЕНТАЛЬНЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ*

**абвяшчае конкурс на саісканне грантаў для маладых навукоўцаў.**

Гранты назначаюцца на тэрмін да 2 гадоў асобным маладым навукоўцам ці групам даследчыкаў — аўтарам фундаментальных і пошукавых даследаванняў, накіраваных на атрыманне якасна новых навуковых вынікаў, якія маюць вялікае тэарэтычнае ці практычнае значэнне.

Саіскальнікамі грантаў могуць быць навуковыя работнікі, спецыялісты, аспіранты, студэнты вышэйшых навучальных устаноў Рэспублікі Беларусь ва ўзросце да 33 гадоў.

Формы заявачных матэрыялаў, а таксама кансультацыі па іх складу і зместу можна атрымаць у выканаўчай дырэкцыі фонду.

Заяўкі на конкурс прымаюцца да 1 снежня 1996 года ўключна. Для іншагародніх дата вызначаецца па штэмпелю на паштовым адпраўленні.

**Матэрыялы накіроўваюцца на адрас выканаўчай дырэкцыі Беларускага рэспубліканскага фонду фундаментальных даследаванняў: 220072, г. Мінск, пр. Ф.Скарыны, д. 66, к. 414, тэл. 268-48-90, 268-57-22, тэлефакс (017) 239-31-62.**

### *Падпіска-97*

**30 лістапада завяршаецца падпіска на газеты і часопісы на першае паўгоддзе 1997 года. Да гэтага часу можна яшчэ паспець падпісацца на часопіс "ВЕСНІК БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА", які ў каталогу рэспубліканскіх падпісных выданняў знайсці няцяжка: сярод тоесных выданняў ён адзін з самых танных. Падпісная цана па серыях такая:**

**Серыя I (Інд. 74851)** — фізіка, матэматыка, інфарматыка (№ 1, студзень; № 2, май) — 32000 рублёў;

**Серыя II (Інд. 74852)** — хімія, біялогія, геаграфія ( № 1, люты; № 2, чэрвень) — 32000 рублёў;

**Серыя III ( Інд. 74853)** — гісторыя, філасофія, сацыялогія, эканоміка, права ( № 1, сакавік) — 16000 рублёў;

**Серыя IV (Інд. 74854)** — філалогія, журналістыка, педагогіка, псіхалогія (№ 1, красавік) — 16000 рублёў.

**Падпіска на часопіс** "Веснік Беларускага дзяржаўнага універсітэта" прымаецца ва ўсіх аддзяленнях паштовай сувязі Рэспублікі Беларусь.

*Нагадаем, што ў розничны продаж часопіс не паступае.*

### *РЭКТАРАТ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА*

**аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасад:**

**Загадчыкаў кафедраў:** тэхналогіі праграміравання, агульнага землязнаўства, тэорыі і практыкі сучаснай журналістыкі, стылістыкі і літаратурнага рэдагавання, тэлебачання і радыёвяшчання, грамадзянскага права, крымінальнага працэсу і пракурорскага нагляду;

**Прафесараў кафедраў:** інтэлектуальных сістэм, педагогікі (0,25 стаўкі);

**Дацэнтаў кафедраў:** лазернай фізікі і спектраскапіі, методыкі выкладання фізікі і інфарматыкі, агульнай фізікі, біяфізікі, гісторыі беларускай літаратуры, рускай літаратуры, рускай мовы, рыторыкі і методыкі выкладання славянскіх моў і літаратур, замежнай літаратуры, тэлебачання і радыёвяшчання, крымінальнага права, канстуцыйнага права, грамадзянскага права, грамадзянскага працэсу і працоўнага права, экалагічнага права, крыміналістыкі, міжнародных адносін, англійскай мовы;

**Старшых выкладчыкаў кафедраў:** грамадзянскага права (0,5 стаўкі), тэатральнага і славянскага мовазнаўства, тэорыі літаратуры, беларускай літаратуры XX стагоддзя, англійскай мовы;

**Выкладчыкаў кафедраў:** канстуцыйнага права, прыкладной лінгвістыкі, рускай мовы, беларускай літаратуры XX стагоддзя, славістыкі;

**Асістэнта кафедры** агульнай фізікі (0,5 стаўкі).

Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.

Адрас: 220050, г.Мінск, праспект Ф.Скарыны, 4, Белдзяржуніверсітэт, аддзел кадраў, пакой 233, тэл. 2-26-59-39.

Аб'ява надрукавана ў газеце "Беларускі універсітэт" 21 лістапада 1996 года.

# Як пражыць на стыпендыю?

Які самы цудоўны момант у жыцці студэнта? Атрымаў пяцёрку? Перадачу ад бацькоў? Стыпендыю!!! Доўгачаканая, яна адразу надае сэнс жыццю і значнасць твайму кашальку. На жаль, не надоўга.

— Распішыцеся,— дзяўчына-касір разліковага цэнтра "Белбізнесбанка" па вуліцы Кастрычніцкай працягнула квіточак,— дзвесце сорак восем тысяч.

На месяц гэтых грошай, канешне, не хапае. Мяркуйце самі.

**23 верасня**

Дзень атрымання стыпендыі. Магу дазволіць сабе ўсё. Шакаладку, напрыклад. Лепш "Аўрору" ці "Вавёрачку", але імпартны шакалад больш прымальны (маю на ўвазе цану).

Дзесяць тысяч павінна сяброўцы па пакоі. Трэба аддаць.

**24 верасня**

Адразу ж занялася падлікам. На дзень даводзіцца 8 тысяч 700 рублёў. Калі купіць кілаграм рысу, то можна варыць яго цэлы тыдзень. Яшчэ трэба масла і пачак чаю.

**26 верасня**

Сёння трэба пад'ехаць на вуліцу Захарава — падыйшоў тэрмін плаціць за пракат тэлевізара.

**27 верасня**

Так мяса хочацца. Сервелат, салямі. Курыца — 44 тысячы? Не, дзякуй. Мясны выраб —"Хлеб мінскі" — 22 тысячы. Дзвесце грамаў, калі ласка. Кетчупу б яшчэ. Вострага. І навошта мне салямі?

**29 верасня**

Я адчула глыбінны сэнс прыказкі наконт сотні сяброў.

— Гуляем, я ганарар атрымала.

Мы сядзелі ў невялічкім кафэ, пацягвалі кактэйль, елі апельсіны і шакаладныя цукеркі.

Вось ужо сапраўды, сябры пазнаюцца, калі жывеш на стыпендыю.

**1 кастрычніка**

Сёння я іду на дзень нараджэння. Можна толькі паснедаць. У якасці падарунка аднясу сваю яшчэ новую (О, шчасце!) бутэльку лаку для валасоў. Сорак тысяч давядзецца патраціць на кветкі. Затое можна павячэраць так, каб раніцай не снедаць.

**2 кастрычніка**

Як добра, што я не куру: пачак цыгарэт каштуе 11 тысяч. Пры ўмове, што курыльшчык выкурвае яго за два дні, за месяц вылятае "на вецер" 150 тысяч. Як усё ж такі добра, што я не куру. Куплю сабе за гэта "Стымарал".

**4 кастрычніка**

Васемнаццаць тысяч каштуе ільготны білет дадому. Увечары адбудзецца святочная вячэра з нагоды прыезду любімай дачушкі. І на наступныя два дні пытанне рацыянальнага харчавання здымаецца. Асабліва мне падабаецца, як маці гатуе рыбу ў цесце — пальчыкі абліжаш.

**6 кастрычніка**

Збірала сумку: слоік вішнёвага (з костачкамі) варэння, тварог, сыр, марынаваныя гуркі і вяндліна. Тата на развітанне сунуў мне ў руку некалькі купюр. Я вельмі люблю сваіх бацькоў.

**8 кастрычніка**

Калі не паем халвы — памру. Я вельмі люблю халву. Я нават і не ведала, як я яе люблю. Да халвы трэба пакет малака. Усяго 9800.

**10 кастрычніка**

І трэба ж было да такога дадумацца — цуд галадання! Напэўна, Поль Брэг таксама быў студэнтам. Інакш, каму б яшчэ маглі прыйсці падобныя ідэі. А тут, бач, і навуковая аснова. Хопіць, не буду думаць пра ежу. На дварэ халодна. Хлопец у скураной куртцы трымае ў руках хотдог і бутэльку піва... Я лепш пачытаю. "Бландзінка прынесла яешню з вяндлінай. Пакуль яна ставіла страву на стол, Хені..."

Трэба раней легчы спаць.

**12 кастрычніка**

Чамусьці грошы не выходзяць з галавы. Усяго засталося 50 тысяч, а наперадзе яшчэ дванаццаць дзён. Цікава, ці думаюць столькі пра грошы работнікі банкаў?

**13 кастрычніка**

Скончыўся цукар. Купляць пакуль не буду. Тым больш, што цукар — белая смерць. Гэта я засвоіла яшчэ ў часы яго "талоннага" продажу... Чорная ікра — чорная смерць. Чырвоная ікра — чырвоная. Пачынаю трызніць...

**14 кастрычніка**

"Ах, оставьте ненужные споры,
Я себе уже всё доказал,—

з дынамікаў студыі гуказапісу разносіўся хрыплаваты голас Высоцкага,—

Лучше гор могут быть только горы,
На которых давно не бывал."

Я даўно збіралася купіць гэтую касету. Заплюшчыўшы вочы, працягваю гандляру шаснаццаць з апошніх трыццаці тысяч.

**16 кастрычніка**

Гіп-гіп, ура! Суседка па пакоі атрымала перадачу з дому. Значыць, будзе многа гасцей.

**17 кастрычніка**

Выхадны, надвор'е цудоўнае. Трэба завітаць у госці да знаёмых. Там мяне частуюць малінавым чаем і булкай з макам. А з вялізным кавуном мы справіліся за некалькі хвілін. Нехта штосьці казаў пра вітаміны...

**18 кастрычніка**

Грошай засталося на палову бохана хлеба...

Яны разыйшліся нават хутчэй, чым я меркавала. Праўда, аказаў падтрымку "бацькоўскі фонд". А іначай... Добра яшчэ, што я не вучуся на платным аддзяленні, студэнтам якога не толькі трэба абыходзіцца без стыпендыі, а нават самім плаціць навучальнай установе за магчымасць атрымаць вышэйшую адукацыю.

*Людміла САВЕЛЬЕВА*



# Тройка, сямёрка, туз...



**Пытанне:** "Ці магчыма ў хмарную нядзельную раніцу не толькі з самага світанку выцягнуць чалавека з ложку, але і выправадзіць яго на другі канец горада, ды яшчэ ў навучальную ўстанову?"

**Адказ:** Магчыма, калі:

1. Гэта раніца прыпадае на 3 лістапада 1996 года.

2. Гэты чалавек любіць брыдж.

3. Гэтая навучальная ўстанова — спорткомплекс БДУ, дзе праходзіў адкрыты кубак універсітэта па брыджу.

А палове дзесятай пачалася рэгістрацыя. Прадстаўнікі каманд адзначаліся ў арганізатараў і цягнулі свае нумары. Цікава было назіраць за іграком "Легіёна" Аляксеем Івановым. Наймагутнейшы хлапчына спачатку хацеў проста папрасіць 13 нумар, а калі ўсляпую выцягнуў яго, дык, расцаніўшы гэта за добрую прыкмету, з віскам бегаў па зале. Брыджысты не першы раз у жыцці пабачылі адзін аднаго, бо па аўторках і суботах, акрамя трох каманд з Маладзечна і дзвюх з Наваполацка, сустракаюцца ў клубе па вуліцы Маркса. Таму гадзіна паміж пачаткам рэгістрацыі і першага тура прабегла ў жартах і падшпільваннях.

Прэзідэнт Беларускага саюза спартыўнага брыджу Ілля Давыдавіч Феранчук заўважыў, што, нягледзячы на трохгадовы тэрмін існавання афіцыйных турніраў па брыджу, гэты кубак першы з выхадам на вялікую аўдыторыю. Таксама ён узгадаў добрым словам спонсараў: газету "Імя", фірмы "Пламекс" і "Эфектыўнае праграміраванне".

Крыху аб правілах гульні. Матч складаецца з сямі раздачаў. Увесь турнір — з сямі тураў. Першыя шэсць пройдуць па швейцарскай сістэме: спачатку прымаецца да ўвагі, хто займае першы і другі радкі турнірнай табліцы, а потым — ці сустракаліся яны раней. Калі не — ім і карты ў рукі. А калі сустракаліся, то ўжо глядзяць на першае і трэцяе месца. І так далей. Апошні тур праводзілі па дацкай сістэме. Першыя садзіліся за столік з другімі, трэція — з чацвёртымі, нягледзячы на мінулыя сустрэчы. Пераможца выяўляецца па сумме VP, а калі яна роўная, то ўлічваецца сумма імпаў. І VP, і імпы падлічваюцца па табліцах, і іх колькасць залежыць ад розніцы ачкоў, якія ўзялі і прайгралі пары (у кожнай камандзе іх дзве) падчас гульні.

Пасля першага тура гульні лідэраў аказалася чацвёра: ММФ +, "W", "Імпас" і "Легіён". У час перапынку ў мяне атрымалася мілая гутарка з настаўнікам матэматыкі 4-й гімназіі горада Мінска Юрыем Пятровічам Млявым. Праўда, яго "Наташа" знаходзіцца не на лідэрскіх пазіцыях, але які журналіст можа адмовіць сабе ў гутарцы з цікавым чалавекам?

**Ю.М.:** Лічу, што брыдж — самая інтэлектуальная гульня з усіх вядомых. Мне ёсць з чым параўноўваць. У свой час у мяне быў 1-ы разрад па шахматах, а тут — толькі трэці. І ўжо шмат гадоў не магу дацягнуць да 2-га. Плюс да ўсяго — брыдж нясе пабочны інтарэс, якога няма ў шахматах.

**Кар.:** У свой час я размаўляла з вядомым беларускім футбалістам Яўгенам Барысавічам Талейкам. Ён зараз працуе дзіцячым трэнерам і рэкамендуе ўсім сваім выхаванцам гуляць у карты на грошы, бо гэта выпрацоўвае ў хлопцаў пачуццё прафесіяналізму. А як Вы?

**Ю.М.:** Справа ў тым, што ў брыдж на грошы ніхто не гуляе. Праўда, ёсць такая разнавіднасць брыджу, як робер, дзе гуляюць на грошы, але ён — не такі цікавы, бо ў ім адсутнічаюць спаборніцтвы. А ў гімназіі з дазволу адміністрацыі я вяду картачны клуб. Мне нават грошы, зусім маленькія, плоцяць за 4 гадзіны ў тыдзень. Праўда, чалавек у нас не вельмі многа, але тры сталы збіраюцца заўсёды. Прыходзьце — мы і Вас навучым.

**Кар.: Дзякуй, але ў мяне ўжо ёсць асабісты настаўнік.**

**Ю.М.:** Я магу дакладна сказаць, што ва ўсіх элітарных коледжах Заходняй Еўропы абавязкова ўваходзіць у праграму спартыўны брыдж.

**Кар.: Юрый Пятровіч, а як гімназісты-брыджысты паводзяць сябе на ўроках матэматыкі?**

**Ю.М.:** Яны ведаюць: калі напрацавалі на "двойку", яны "двойкі" і атрымаюць. А калі адказваюць на "пяцёрку", то я ім "пяцёрку" і пастаўлю. І брыдж да гэтага ніякіх адносін не мае. Тым больш, што ў нас вучацца дзеці, якія разумеюць, — трэба вучыцца. А брыдж — гэта хобі.

**Кар.: А ці здаралася Вам прайграваць сваім навучэнцам?**



**Ю.М.:** Вядома, прайграваў і я, бо брыдж — гульня ўзакрытую. Няверна зрабіў выснову, памыліўся і — прайграў. І яны вельмі шчаслівыя. Але ўрэшце ўсё адно пераможцам застаюся.



У другім туры "W" не стрымаў націску "Імпаса" і апынуўся на 5-6 месцы разам з МРТІ (па 37 VP), але і "Імпас" сышоў на прыступку ўніз і падзяліў яе з "Вертыкаллю", якая ўварвалася ў тройку лідэраў (па 43 VP). А ММФ + адкаціў "Легіён" аж у канец 1-й дзесяткі і застаўся аднаасобным лідэрам.

Я звярнулася да іграка ММФ+ Алега Ціхановіча.

**Кар.: Мне адрэкамендавалі Вас як класіка беларускага брыджу.**

**А.Ц.:** Я сам прыдумаў сабе гэтае званне, хоць і не на пустым месцы — пасля перамогі ў Балтыйскай лізе ў 1992 годзе. (Такіх "класікаў" — усяго 5 чалавек.) Пачыналася ўсё ўвосень 1989 года. У наступным годзе я выйграў адбор у зборную, праўда, выпадкова, але... Потым да нас прыехалі палякі — уздымаць узровень нашага майстэрства.

**Кар.: А "зорны" 92-і — таксама выпадковасць?**

**А.Ц.:** Ні ў якім разе. Мы ўпершыню на Балтыйскай лізе выбраліся тады з апошняга месца, у нас гуляла вядучая беларуская тагачасная пара Громаў-Медушэўскі. Дый мой партнёр Градоўскі — ігрок вельмі моцны.

**Кар.: Што такое ММФ +?**

**А.Ц.:** У нас у камандзе 4 выпускнікі мехмата і адзін — з ФПМ: Андрэй Арловіч, Юра Бялейчык, Андрэй Сотнікаў, Ігар Радзюкевіч і я.

Пасля 3-га тура лідэры памяняліся месцамі: "Імпас" (68 VP) абышоў ММФ + (61 VP), і на адну прыступку апусцілася "Вертыкаль" (57 VP). У трох VP ад яе размясціўся МРТІ (54), а яму ў спіну дыхаў "Легіён" (53 VP). Гэты тур быў правальным для спонсарскай каманды "Пламэкс", за якую гуляе В.М.Яненка, старшы трэнер прафсаюзнай школы па шахматах і шашках, адзін з наймацнейшых ігракоў у мінскім клубе.

Чацвёрты тур яшчэ больш умацаваў пазіцыі "Імпаса", другой была "Вертыкаль", а за 3-е месца спрачаліся ММФ + і "W". Вельмі цікава было назіраць за гульнёй пары з каманды "W" — грандам беларускага брыджу Алегам Градоўскім і яго юным партнёрам Вадзімам Басалыгам.

**В.Б.:** Я займаюся брыджам каля 5 гадоў. Зараз, вось ужо два гады, гуляю за каманду "W" сярод былых чэмпіёнаў "Накаута" і кубка Беларусі мінулага сезону.

**Кар.: Вадзім, твой партнёр — вядомы беларускі брыджыст. Яго аўтарытэт на цябе не ціснe?**

**В.Б.:** Ужо не, бо я не навічок у гэтай справе. А раней — было: так атрымалася, што ён быў маім настаўнікам. Вы ведаеце, чым адрозніваецца прафесіянал ад непрафесіянала? Прафесіянал памыляецца менш. Вельмі часта атрымліваецца, што разумееш, як трэба было згуляць, толькі пасля таго, як складзеш карты.

Пятая гульня "не пайшла" ў лідэра: "Імпас" прапусціў наперад і "Вертыкаль", і ММФ +.

Шосты тур нічога новага ў расклад лідэраў не прынёс: паранейшаму першай была "Вертыкаль", за ёй — ММФ + і "Імпас". Было каля пяці гадзінаў вечара, усе стаміліся. Шмат хто скардзіўся на галаўны боль, а некаторыя ўжо не бачылі карты. Я вырашыла не надакучваць нікому пытаннямі, пагатоў апошні тур мог усё карэнна змяніць.

На першае месца ў выніку сёмага тура выйшаў "Імпас" (131 VP), які не нашмат апярэдзіў "Вертыкаль" (130 VP). Трэцім быў ММФ + (126 VP). На пачатку сёмай гадзіны, калі ўсе галовы рашуча адмовіліся што-небудзь разумець, пачалося ўзнагароджанне. Апрача пераможцаў прыз камандзе, сумарны ўзрост ігракоў якой быў менш за 90 ці больш за 150 гадоў, атрымала "2х2". Лепшай мікставай камандай (не менш за 2 жанчыны) прызналі "Імя", а лепшым з невысокакваліфікаваных камандаў (рэйтынг менш за 3) быў "Легіён".

*Вольга КАЗДЗЕРКА*

P.S.: Аўтар артыкула дзякуе Віталю Зубку, Міхаілу Свістунову і Герману Панчанкаву за дапамогу пры рабоце на турніры і інфармацыю па правілах і гісторыі брыджу.

## Позірк з-пад брыва

# Асцярожна, “Гербалайф”!

## ці Суб’ектыўныя нататкі з адной прэзентацыі

Апачыналася ўсё так. На падыходзе да сталічнага ГУМа мяне спыніў малады чалавек і запрасіў на выставу-продаж нейкай унікальнай касметыкі, што павінна адбыцца ў Палацы шахмат і шашак. Там можна будзе яе пабачыць, атрымаць поўную інфармацыю і, пры жаданні, набыць. Словам, “прыходзьце!”

Тое, што запрашэнне падпісана жаночым прозвішчам, а назва фірмы-распаўсюджвальніцы нідзе не ўзгадваецца, здалося падазроным. Але цікаўнасць узяла верх, і, узяўшы па звычцы дыктафон, я накіравалася на абяцаную прэзентацыю.

Народ стаў збірацца за гадзіну да пачатку. Стомленыя і выматаныя пасля працоўнага дня жанчыны прыйшлі сюды відавочна не дзеля таго, каб пабачыць цуд-касметыку. Ім, як высветлілася, прапанавалі стаць еймымі рэалізатарамі. “Калі ў кіёску прадаваць, дык згаджуся, а калі хадзіць з торбай па кватэрах, дык не па сілах ужо,”— наракала адна з іх. За размовамі пра прэзідэнта, рэферэндум, беспрацоўе і брак грошай час мінаў хутка. Народ усё падыходзіў. Натоўп стракацеў. Тут прысутнічалі ўсе ўзроставыя катэгорыі: пенсіянеры, рабочыя сярэдніх гадоў і, канешне, студэнты. Умеюць жа ў нас прыцягнуць народ! Я далічыла да 60 і збілася, а ў холе заставалася яшчэ чалавек 30. Прыйшлі людзі пераважна не дзеля таго, каб паглядзець і купіць, а з іншай мэтай — атрымаць работу. Хай не зусім па душы, але — хоць нейкія грошы. Нас жа даўно ўжо навучылі разлічваць толькі на саміх сябе, не спадзеючыся на дзяржаўныя падачкі, якія называюцца чамусьці стыпендыямі, заробкамі і пенсіямі.

Усе надзеі абрушыліся, калі туды-сюды забегалі маладыя людзі з усім вядомымі і досыць абрыдлымі значкамі “Як схуднець”, “Як патаўсцець” і “Як стаць шчаслівым”. Словам, запахла гербалайфам. У натоўпе прайшоў гул незадавальнення. Работа, грошы,— надзеі лопнулі, як мыльныя бурбалкі. Зноў падман! А нідзе ж не ўказана, што гэта славуты “Гербалайф” вырашыў тут наладзіць чарговае шоў, прабачце, прэзентацыю. Спытаўшы пра гэта адна-го з прадстаўнікоў слаўнай кампаніі, я атрымала сціслы адказ: “Тут такія законы”. Што ж, законы “пад сябе” ў нас пісаць умеюць. На розных узроўнях.

Іншы гербалайфшчык быў больш шчырым і прамовіў “ісціну”: маўляў, у народа прадузята негатыўнае стаўленне і да фірмы, і да цуд-прадукцыі. Ну, карэнна няправільнае! І паколькі адкрытая агітацыя не дае жаданых вынікаў (бо нават тыя, каму вельмі патрэбна праца, указваюць: “Інтым, гербалайф не прапаноўваць”), дык і даводзіцца канспіравацца.

Нарэшце, усіх запрасілі ў залу, якая напалову была ўжо запоўнена самімі гербалайфшчыкамі. Спачатку ішла даведка пра кампанію: заснаваная ў 1980 годзе, мае афіцыйныя прадстаўніцтвы ў 33 краінах свету. Найбольш хутка павялічваецца з усіх карпарацый ЗША. Праца вядзецца ў трох накірунках: прадукты харчавання, французская эксклюзіўная касметыка і такая ж парфума. Зала ўздыхнула — нібыта да справы падышлі. Ажно не. Мімаходзь узгадаўшы пра калекцыю па догляду за скурай твару і валасамі, а таксама пра серыю духоў пад назвай “Эсэнцыя жыцця”, прадстаўленымі на рынак Францыі, усё пайшло сваёй чаргой. Касметыкай тут і не пахла.

А далей сцэнарый развіваўся “паводле Кашпіроўскага”: гербалайфшчык падыходзіў да мікрафона, паведамляў, чым хварэў і як, адкушаўшы прадукт, атрымаў цудоўныя вынікі. Урэшце, усе выступоўцы-жанчыны “сышлі ў аб’ёмах сантыметраў на 30”, у некага разагнулася спіна, рассмакталіся рубцы і знікла алергія і г.д. “Мы вельмі шчаслівыя. “Гербалайф” — месца, дзе здзяйсняюцца мары!”

Потым стала яшчэ цікавей — размова пайшла пра грошы, гэта значыць пра заробак. У запрошаных была магчымасць пабачыць новых мілянераў, прыбыткі якіх, па іхных жа словах, перавышаюць 10 мільёнаў рублёў у месяц. Словам, “надзеў значок — сабраў багацце”. А атрымаць за дзён 15 мільёны так 2-3, працуючы пры гэтым адну гадзіну ў дзень, аказваецца,— раз плюнуць. Так званыя босы шчыравалі, ніколькі не баючыся ні прагных вачэй залы, ні надыходу сутоння. Відаць, дабіраюцца дадому яны збіраліся зусім не грамадскім транспартам.

Для тых, хто зацікавіўся і жадае імгненна разбагацець,— кароткая даведка: запісацца ў стыльныя шэрагі гербалайфшчыкаў можна за 100 долараў. Сотня “зялёных” — і Вы дыстрыб’ютар. Яшчэ 4 тысячы такіх самых — і Вы ўжо інспектар і г.д. Пры гэтым “у Вас будзе цудпрадукт, здароўе і мора грошай. А для гэтага трэба кушаць усё той жа прадукт, насіць значок і размаўляць з людзьмі”. Ну, астатняе вы ведаеце. Вось такая рэклама.

А цяпер пра рэчы больш сур’ёзныя. Да якога ж часу такія кампаніі будуць дурыць людзей, запрашаючы на разнастайныя выставы, продажы, семінары і г.д., але толькі не туды, чым гэта аказваецца па праўдзе?! Да якога часу людзей будуць тармасіць такія “працадаўцы” і прапаноўваць усе гэтыя “высокааплачваныя, у вольны час, незалежна ад месца жыхарства” (а на самой справе, як правіла, звычайны фальш) і патрабаваць уступны ўзнос у памеры ста долараў?! Гэта для беспрацоўных! Пазбаў нас, Божа, ад такіх працадаўцаў. І, нарэшце, да якога часу нашы ўсімі паважаныя, але такія збяднелыя сёння ўстановы, як Дом настаўніка, Палац шахмат і шашак і мноства іншых, будуць вымушаныя здаваць сваю плошчу ў арэнду падобным арганізацыям?! Пытанні рытарычныя? На жаль, так. А дужа ж хочацца атрымаць адказ.

***Святлана ШАБЛІНСКАЯ***

## Наша здароўе

# УЦЯЧЫ АД ХВАРОБАЎ

Сучасны чалавек у параўнанні з гараджанамі міну лага стагоддзя прыкладае ў сто разоў менш фізічных намаганняў. Не кожны робіць на працягу дня і 10 тысяч крокаў — тую мінімальную норму, якую фізіёлагі лічаць абавязковай для падтрымання добрай працаздольнасці і здароўя.

Хада даступная ўсім. І хаця яна даецца ад нараджэння, а таму і здаецца малазначнай і не такой эфектыўнай, як фігурнае катанне ці хуткасны спуск на лыжах, тым не менш, карысць ад яе вельмі вялікая. Яна ўмацоўвае сэрца, заспакойвае нервы, паляпшае працу мозгу, выратоўвае ад залішняй вагі. Галоўнае — хадзіць штодзённа.

Яшчэ адзін цудоўны аздараўленчы сродак — бег. Ён выдатна трэніруе сэрца, а ў сучасных умовах менавіта сардэчна-сасудзістая сістэма атрымліваецца самым слабым месцам у нашым арганізме. Глыбокае і частае дыханне бегуна — своеасаблівая дыхальная гімнастыка, падчас якой масіруюцца лёгкія, пячонка, селязёнка, страўнік, кішэчнік. Такі масаж прадухіляе застой жоўці, запоры, змяншае тлушчавыя адкладанні.

Бег — гэта яшчэ і цудоўны сродак умацавання псіхікі. Нервовыя людзі, пачаўшы бегаць, становяцца менш раздражальнымі. Бег пазбаўляе пачуцця трывогі, вылечвае ад бяссоння.

А цяпер некалькі парадаў тым, хто вырашыў заняцца бегам:

1. Бег лепей пачынаць з размінкі. Яе працягласць — 5-10 хвілінаў. Гэтага часу зусім дастаткова, каб разагрэць мышцы.

2. Памятайце, што нагрузка мусіць адпавядаць функцыянальным магчымасцям арганізма, таму ніколі не бегайце разам з больш маладымі і моцнымі. Для правільнай ацэнкі стану свайго здароўя папярэдне наведайце доктара.

3. Бег павінен прыносіць радасць, а не ператварацца ў цяжкую механічную работу: у такім разе заняткі губляюць усялякі сэнс.

4. Бег мусіць быць лёгкім, вольным, рытмічным, натуральным. Неабходна падабраць для сябе аптымальную хуткасць.

5. Бегаць аднаму — найважнейшы прынцып трэніроўкі, асабліва ў першы час. Інакш немагчыма вызначыць аптымальную хуткасць бегу і атрымаць задавальненне. Пры бегу групай непазбежна ўзнікаюць напружанне, незаўважнае павелічэнне хуткасці, якія адмоўна ўплываюць на арганізм. Індывідуальныя асаблівасці кожнага (стан здароўя, фізічная падрыхтоўка і інш.) не дазваляюць падабраць агульную хуткасць для двух чалавек.

6. Бегаць трэба рэгулярна: штодзённа або праз дзень.

7. Нагрузка, асабліва на пачатку заняткаў, не павінна выклікаць выяўленай стомы і зніжэння працаздольнасці. Пачуццё млявасці і санлівасці днём — пэўная прыкмета таго, што нагрузку трэба зменшыць. Кантроль — па пульсу: калі праз 3 хвіліны пасля бегу пульс вяртаецца да ранейшай велічыні, то выбраная дыстанцыя для вас прымальная.

***Т.МІЛЕЙКА,***
***доктар-кардыёлаг 2-й гарадской клінічнай бальніцы***

# Дапамога спецгрупам

Чацвёртая частка студэнтаў БДУ займаецца фізкультурай у спецгрупах. 25% — гэта не жарты. Сваю ролю тут, канешне, адыграў Чарнобыль, многія яшчэ са школы хварэюць на блізарукасць, скардзяцца на сэрца... Іх нельга проста кінуць на стадыёне, загадаўшы бегаць: хваробы могуць нагадаць пра сябе. Кожнаму патрэбна індывідуальная карэкцыя.

Педагагічныя метады кантролю ў працы са спецгрупай выкарыстоўвае ўжо 23 гады Ала Іванаўна Расолька. У яе, акрамя дысертацыі, напісана яшчэ 20 працаў па праблемах спецгрупы.

Заняткі грунтуюцца на тым, што кожны студэнт вывучае сваю хваробу. Для тэарэтычнай падрыхтоўкі пішуцца рэфераты. І да сканчэння 3-га курса кожны ўжо можа правесці ў групах комплексы практыкаванняў па сваіх дыягназах.

Зразумела, што выкладчык павінен ахапіць усе хваробы, дасканала авалодаць лекавай фізкультурай. Асноўным крытэрыем у педагагічным працэсе з’яўляецца пульс. Для яго вызначэння пажадана мець прыборы кантролю. Звычайна ў групах карысталіся маленькай “Электронікай-56”, якая дапамагала кожнаму студэнту самастойна кантраляваць сардэчна-сасудзістую сістэму, ведаць сваю норму і не перанапружвацца. Сёлета універсітэцкая лабараторыя біяпедагагічнага кантролю ўсталявала ў спартыўнай зале новы прыбор “Чибис”. Праўда, ён прызначаецца для фізічна здаровых людзей, а ў гэтых умовах можа выкарыстоўвацца толькі для першапачатковага замярэння пульсу, бо з прычыны нізкай адаптацыі студэнтаў спецгрупаў пульс у іх пасля заняткаў на працягу пэўнага часу мяняецца. Але прыбор усё ж такі дапамагае студэнтам і выкладчыкам сачыць за станам здароўя ў час фізічных нагрузак.

***Валерыя АЎСЯНІК***

## ДАІ паведамляе

### *Аперацыя “Пешаход”*

*З 10 па 30 кастрычніка ў Мінску праводзілася аперацыя “Пешаход”.*

*За папярэднія 9 месяцаў у Мінску адбылося 527 дародна-транспартных здарэнняў, у якіх загінуў 61, параненыя 536 чалавек. Толькі ў Маскоўскім раёне адбылося 67 ДТЗ, у якіх загінулі 5, параненыя 75 чалавек. За восем месяцаў у Маскоўскім раёне выяўленыя 1926 парушальнікаў дарожнага руху. Сярод парушальнікаў ёсць і студэнты БДУ: Юрамік А.А., Барушка К.С., Верашчагін Р.В., Раманаў С.В., Панамароў Ю.В. і іншыя.*

*Найбольшая колькасць ДТЗ прыпадае на час, калі надыходзяць прыцемкі. Таму заклікаем быць асабліва ўважлівымі ў гэты час сутак.*

*Выкананне Правілаў дарожнага руху служыць інтарэсам Вашай бяспекі.*

***А.КУДРАЎЦАЎ,***
***дзяржаўтаінспектар Маскоўскага ДАІ***

Пра хваробы, якія перадаюцца палавым шляхам, якія называюць венерычнымі, у народзе кажуць, што гэта хваробы ад задавальнення. Але якое ж гэта задавальненне, калі яно прыносіць хваробу! У медыкаў да гэтага стаўленне іншае.

# Хочаш — будзе, хочаш — не!

Статыстыка — упартая рэч, а яна кажа, што па выніках 1995 года захворванне на сіфіліс у Беларусі вырасла ў параўнанні з 1988 годам больш чым у 107 разоў! Аднак аказваецца, што і гэты рэкорд (ніколі раней за апошнія 70 гадоў такога захворвання на пранцы, як інакш называюць гэтую хваробу, не было) далёкі ад абсалютнага. Калі за 8 месяцаў 1995 года было зарэгістравана 8830 хворых на сіфіліс, дык за 8 месяцаў гэтага года ўжо зарэгістравана 13579 хворых, а нарадзе ж яшчэ чатыры месяцы, калі мы “жнем” ураджай перыяду адпачынкаў.

Сіфіліс — інфекцыйная хвароба, якая перадаецца пераважна палавым шляхам і мае інкубацыйны перыяд ад трох да васьмі тыдняў і больш. Ужо з канца трэцяга тыдня інфіцыраванасці ён перадае інфекцыйную бледную трэпанему свайму палавому партнёру, напрыклад, жонцы. А ў той ёсць маленькае дзіця, якое яна цалуе, корміць. Доўга не ведаючы пра сваю хваробу, жанчына нікуды не звяртаецца, і ў выніку першасны сіфіліс пераходзіць у другасны, пры якім амаль 70% пацыентаў маюць высыпанні ў роце. Так, маці, зусім таго не жадаючы, здзяйсняе злачынства — заражае пранцамі сваё ўласнае дзіця.

У Беларусі вызначыўся выяўлены рост сіфіліса ў дзяцей, як прыроджанага, так і набытага. Летась у Мінску было 5 выпадкаў прыроджанага і 11 выпадкаў набытага сіфіліса ў дзяцей.

Але як гаворыцца ў “Сіфіліядзе” (увогуле венерычных хваробы не абыйдзеныя ўвагай: ёсць “Сіфіліяда”, ёсць “Ганарэяда”):

И хотя он и опасен,  
И приносит сотни бед,  
Чем он, сифилис, прекрасен:  
Хочешь — будет, хочешь — нет.

І ў гэтым сутнасць праблемы — у нашых з вамі паводзінах, у захаванні маралі, у кіраванні прынцыпамі здаровага ладу жыцця.

***Л. ПАНКРАТАВА,***
***загадчык аддзялення пералівання крыві 2-й гарадской клінічнай бальніцы г.Мінска***

## Юбілеі

# Віншуем!

### Лістапад

**Віншуем рэктарат** з тым, што ў лістападзе 1922 года рэктар БДУ прафесар У.І.Пічэта прачытаў курс платных лекцыяў для насельніцтва! А грошы, між іншым, перадаў для маламаёмасных студэнтаў. Хто з прафесараў хоча паўтарыць?

**Віншуем студэнтаў-хімікаў** з тым, што ў 1929 годзе на іх факультэце была ўведзеная бесперапынная вытворчая практыка. Беспрацоўе ім тады не пагражала, ці што...

**Віншуем усіх аматараў аўта- і мотатэхнікі** з 45-годдзем сустрэчы студэнтаў БДУ са студэнтамі МДУ — удзельнікамі мотапрабегу Масква-Мінск. Дарэчы, чаму "мотапрабег", калі яны не беглі, а ехалі?

**Віншуем маладзёжных лідэраў** розных пакаленняў з 30-годдзем стварэння вочна-завочнай школы камсамольскага актыву універсітэта.





**Віншуем прыхільнікаў перабудовы,** паскарэння, новага мыслення з абраннем М.Гарбачова сакратаром парткама БДУ ў1969 годзе. Хоць і не той, але ўсё ж такі...

**Віншуем усіх,** хто лічыць сябе цікавым чалавекам з 25-годдзем стварэння ў БДУ клуба цікавых сустрэч. Занудным сябе, напэўна, не лічыць ніхто...

**Віншуем эканамістаў** з тым, што 25-26 лістапада 1976 года ва універсітэце прайшла Міжрэспубліканская навуковая канферэнцыя па пытаннях крытыкі антымарксісцкіх эканамічных тэорыяў. Хто б мог падумаць, што пакрытыкаваць можна і Маркса!

**Віншуем прыхільнікаў камуністычнага шляху развіцця** з тым, што ў 1978 годзе адбыўся мітынг, прысвечаны 60-годдзю Кампартыі Грэцыі. Сапраўды, у Грэцыі ўсё ёсць. І нават кампартыя...

**Віншуем усіх зацікаўленых** з Міжнародным днём студэнта. Як вам святкавалася?



*Фотаздымкі зроблены падчас святкавання 75-годдзя БДУ каля Палаца спорту.*

## Гэта яшчэ трэба зразумець!

# Слова — не верабей...

*У мяне на плоце, ведаеш, што напісана? А там — дровы ляжаць.*

*Не памятаю, ад каго першага пачуў*

Са мной здарыўся казус — у мяне ўзнікла патрэба. Зараз ужо не дужа істотна — вялікая гэта была патрэба ці малая. Важней тое, што я зайшоў у мужчынскую прыбіральню аднаго з факультэтаў...

Кожны, каму даводзілася хаця б раз наведваць падобныя месцы, пацвердзіць, што сценкі і дзверы грамадскіх прыбіральняў ззяюць цнатлівай некранутасцю і чысцінёй хіба што першыя два тыдні. Потым яны расквечваюцца разнастайнымі малюнкамі (пераважна — пахабнымі) ды надпісамі — графіці (як кажуць нашыя калегі — студэнты-гісторыкі).

Натуральна, што я зацікавіўся праявамі разумовых высілкаў інтэлектуальнай эліты нашага грамадства, якой лічацца студэнты. Гэта ж не якія-небудзь хуліганы, што пэцкаюць сцены дамоў. Можна казаць, гэтыя надпісы — тое, пра што думаюць студэнты нашага універсітэта ў вольны ад навучання час.

На мой вялікі жаль, не ўдалося наведаць усе факультэты (надта ж шырока раскінуўся БДУ па гораду), але нават тое нешматлікае, што мне ўдалося пабачыць, уражвае.

Як буяе фантазія нашых студэнтаў! Куды там камандзе КВЗ. Якія фантаны дасціпнасці, вадаспады весялосці! Чаго варты хіба адзін толькі шматкроць паўтораны ў новаадрамантаваных прыбіральнях галоўнага корпуса надпіс "Райское наслаждение". Гэта ж якія надзвычайныя пакуты трэба вытрываць на бясконцай лекцыі, каб так шчыра ўзрадавацца...

Аднак, як ні прыкра гэта ўсведамляць, не ва ўсіх з'яўляюцца аптымістычныя думкі. Некаторыя студэнты (большая частка якіх вучыцца чамусьці на філфаку) пакідаюць пасля сябе палітычныя надпісы. Наколькі ж трэба любіць Радзіму, падумалася мне, каб нават у такім месцы думаць пра палітыку!

Дзякаваць Богу, нават на гэтым факультэце сустракаюцца людзі, якіх больш цікавяць іншыя бакі жыцця. Менавіта ім належыць двухсэнсоўны надпіс "В твоих руках — твоё богатство". І, верагодна, у гэтым асяроддзі нарадзілася графіці, якое адлюстроўвае вечную перасцярогу студэнта перад выкладчыкам: "Оставь надежду, всяк отсюда выходящий". Сапраўды, што можа лепш перадаць адчуванне небяспекі, чым гэты перафразаваны афарызм Дантэ! З гэтым не можа параўнацца нават песімістычны надпіс студэнтаў-географаў "No future & No exit" (Няма будучыні і няма выйсця).

Зрэшты, не адныя філолагі імкнуцца бліскануць сваім веданнем класічнай літаратуры. Прыбіральня гістфака вітае наведвальнікаў знаёмай яшчэ са школы фразай: "Тут русский дух, тут Русью пахнет".

Вядома, не ўсе надпісы я магу працытаваць у сваіх нататках: некаторыя з іх — нецэнзурныя, некаторыя — урыўкі з прыватнай сяброўскай перапіскі, некаторыя — праявы любові да заходніх рок-гуртоў, якая апаноўвае фанаў і ў прыбіральні...

Напрыканцы хацеў бы зрабіць дзве заўвагі. З аднаго боку, пісаць на сценках — канешне ж, непрыгожа, нядобра, непрыстойна. Але з другога боку, менавіта па такіх графіці сучасныя гісторыкі даследуюць культуру мінулых эпох. Ці можам мы пакінуць беспрацоўнымі будучых гісторыкаў?

***Надпісы чытаў Паўлік РЫЛЕЙШЫН***

## Гасцёўня

***У гэтым нумары рэдакцыя "Беларускага універсітэта" прадстаўляе чытачам вершы, аўтар якіх -- студэнтка філалагічнага факультэта Лія НОВІЧ. Аматары прыгожага пісьменства пабачаць, што перад імі не ардынарная з'ява, а сапраўдная Паэзія. Мы абяцаем, што гэта не апошняя сустрэча з вершамі Ліі, і маем намер надалей друкаваць яе творы.***

# Галерея

### I

Почему мне нравится этот череп,
Эта капля олова, подвижная снизу,
Снизу вверх волнующая поверхность,
Этот овал лба и затылка,
Кудри ресниц — гипербола взгляда.
Поздний ренессанс еврейского лика:
Желток чела и ровного носа —
Дыхания крылья —
И руки
Охра кандела вытянула из
Канифоли, темноты, пространства — не знаю,—
Этот мыслящий объем
И вылепила, и покрыла влагой.
А он говорит.
И стало тихо.
Самовар откипел,
И бульканье кипятка не создает шума,
И не мешает слушать сопенье множества.
Всё почило.

### 2
### Неоконченный портрет

Линии наискось белого поля
Собраны в грифеле в мраморный профиль,
В плоскость лица
И кончиков связанных
Пальцев —
Сосками, скрепленными спицей
Друг с другом
После сползания ткани
По матовым трещинам стекол межгрудья.

Старость.
Усталая старость Китая;
Кожа повисла
На скул изломе.
Может быть, снимут ее и наденут,
Чтобы...
Но если допишут картину.

Пока только мертвая хватка молчанья,
Пока только пломбы дробятся зубами,
Пока только ноги натянуты в раму.
Пока только сжатая чистая чашка
И темная медь
Чая в фарфоре,
Задуманном быть прозрачным стаканом.

### 3
### Голова Олоферна

Не уносите мрамор
Из полуподвала,
Из скользких складок ткани Ватилуи:
Пока он среди хлеба и осколков,
Изюма сытного и белых крошек,
Он то, что высекается из камня,
Или он то, что камень отряхает.
Плоть сброшена с постели,
Столбы голы,
С них снято дорогое покрывало
И вперемежку с пятнами от солнца,
Проникшего через восьмые щели,
На черном шелке
Кусками тело,
Ярясь от страсти,
Двукратно бьется.
А мраморную голову схватила
За волосы Рука —
В ней нет аффекта
Язычества, религий, суеверий,
Мистификаций, веры, фанатизма,
Как предрассудка, так и скептицизма —
Архимомент,
Беспечность, бесконечность,
И голова в покое Олоферна.

# Тишина

(Верлибрический сонет)

Из-за углов удивляющих зданий,
Наставленных вдруг на знакомом месте,
Выросла длинная лунная маска,
Оправдавшая формой овал фонарей.

Фонарь и луна на волне вакуума
Качаются в такт моему движению.
Их параллельность глуха и бессмысленна:
Нечего передавать в разреженном
пространстве.

Разбитые окна линией звездной —
Отразившейся в реках вдоль полета —
Мчатся
в стремлении под ноги тени —
Меня, освещаемой со спины.

В этом отсутствии стороннего взгляда —
Потусторонняя тишина ночи.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ
Заснавальнік газеты - рэктарат БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

*Мінская паліграфічная фабрыка "Чырвоная зорка" МВПА імя Я.Коласа. 220079, г. Мінск, 1-ы Загарадны зав., 3.*

*Газета падпісана ў друк у 12.00.*

*21 ЛІСТАПАДА*
*Зак. 2014.*
*Т. 1000 экз.*

*220080, Мінск-80, Універсітэцкі гарадок, вул. Бабруйская, 9, паверх 4, пакоі 411-412, тэлефон 2206827.*

В.а. рэдактара Т.М. КАЗАК